5. Реклама МТС – Богиня шопинга – С Нагиевым, Сычевым и Горбань [видеозапись] // YouTube. – Режим доступа: www.youtube.com/watch?v=LO2TipIc2fw&feature=emb_imp_woyt. – Дата доступа: 12.03.2021.
6. Реклама Venus – Регина Тодоренко [видеозапись] // YouTube. – Режим доступа: www.youtube.com/watch?v=xbSiKZAFpv4&feature=emb_imp_woyt. – Дата доступа: 12.03.2021.
7. Халеева, И. И. Гендер как интрига познания / И. И. Халеева // Гендер как интрига познания. – М., 2000. – С. 8–13.
8. Old Spice Багамы: да, я на коне [видеозапись] // YouTube. – Режим доступа: www.youtube.com/watch?v=cTwQ6T7kab4&feature=emb_imp_woyt. – Дата доступа: 12.03.2021.
9. Snickers с Волочковой (2011) [видеозапись] // YouTube. – Режим доступа: www.youtube.com/watch?v=IhRKiSR7TeM. – Дата доступа: 12.03.2021.
10. Veet (восковые полоски) naturals – Будь по-настоящему женственной [видеозапись] // YouTube. – Режим доступа: www.youtube.com/watch?v=BXXSuc8E6Ko&feature=emb_imp_woyt. – Дата доступа: 12.03.2021.

# ГУКАПІС ЯК СТЫЛІСТЫЧНЫ ПРЫЁМ У МОВЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ

*Г. А. Талочка (Мінск, Беларусь)*

У артыкуле прадстаўлена інфармацыя пра гукапіс як стылістычны прыём у мове мастацкіх твораў (на матэрыяле вершаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Р. Барадуліна, А. Разанава, Х. Лялько), паказаны шляхі яго рэалізацыі ў паэтычных творах. Тлумачыцца ўздзеянне гукавога афармлення на семантыку слова, тэксту. Разглядаецца роля такіх элементаў мастацкага гукапісу і актуалізацыі тэкставай фонасемантыкі, як алітэрацыя, асананс, анафара, эпіфара і інш.

***Ключавыя словы:*** гукапіс; асананс; алітэрацыя; гук; стылістычны прыём.

Вядома, што змест паэтычнага твора знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з гукавым афармленнем. Менавіта гукавое афармленне і вызначае паэзію як від творчасці. Эксперыментальна даказана, што фанетычнае афармленне твора можа ў такой жа ступені адлюстраваць сэнс тэксту, як і яго семантычны змест. Фонасемантыка мастацкага тэксту развіваецца на мяжы стылістыкі мастацкай літаратуры, паэтыкі і даследуе праявы гукавыяўленчасці з эстэтычнага боку. Фонасемантычныя прынцыпы пабудовы тэксту спачатку з'яўляліся на матэрыяле мастацкіх твораў. Відавочна, што тут сувязь гуку і сэнсу праяўляецца найбольш выразна. Таму даследаванні паэтычных твораў з'яўляюцца самымі распрацаванымі ў галіне фонасемантыкі. Пачалі актыўна распацоўвацца тэрміны *гукапіс, асананс, алітэрацыя, паўтор.*

*Гукапіс літаратурны* (ад гр. fōnikós – той, што гучыць) – гукавая арганізацыя літаратурнай мовы, якая ўзмацняе сэнсавую выразнасць і мілагучнасць мастацкага твора [2, с. 51].

Даследчыкі вылучаюць такія элементы мастацкага гукапісу і актуалізацыі тэкставай фонасемантыкі, як *алітэрацыя, асананс, анаматапея, анафара,*

*эпіфара*. Яны асабліва ярка выяўляюцца ў паэтычных і празаічных творах і часцей за ўсё выражаюць аўтарскі светапогляд.

Г. М. Малажай адзначае, што мастак слова «не проста карыстаецца гукапісам як прыёмам уздзеяння на чытачоў, ён у творчым працэсе так бачыць, так думае, так адчувае, таму і ўспамінаюцца, падбіраюцца словы адпаведнага сэнсу, гучання» [1, с. 102].

Вывучэннем гукапісу паэтычных твораў займаліся такія навукоўцы, як Б. В. Тамашэўскі, К. Ф. Тараноўскі, В. М. Жырмунскі, Л. І. Цімафееў, В. П. Рагойша.

На сённяшні дзень няма ўніверсальнай працы прысвечанай фанетыцы паэтычнага твора. Гэта звязана са спецыфічнай прыродай самой фанетыкі. Мы адрозніваем пісьменніка па стылю пісьма, а гукавая структура яго твораў з'яўляецца адным з яго кампанентаў. Усе мастацкія творы непаўторныя ў сваім гучанні. Нельга фанетычную арганізацыю кожнага з іх аб'яднаць і звесці да адзінай сістэмы.

Яркім прыкладам мастацкага выкарыстання паэтам гукапісу з'яўляецца верш Рыгора Барадуліна «Матылёк»: «*Л*і*л*ею м*л*явы п*л*ёс *л*ю*л*яе, / З-пад з*л*ежаных аб*л*ок зда*л*ёк / *Л*яціць віх*л*ясты і бя*л*явы, / Пя*л*ёстак *л*ёгкі – матыл*ё*к. / Ён к*л*іча у б*л*акіт *л*і*л*ею, / Каб не *л*юбі*л*а бо*л*ьш да с*л*ёз / Б*л*іскучы ад *л*ускі і г*л*ею, / Сам*л*е-*л*ы, абмя*л*е*л*ы п*л*ёс, / Дзе *л*ашчыць цёп*л*ай *л*аскай хва*л*я / *Л*інёў – з*л*яне*л*ых це*л*ьпукоў, / Паб*л*ісквае няб*л*ізка да*л*еч, / Дзе ў і*л*е не з*л*ічыць ма*л*ькоў, / Дзе г*л*ыб угнеўнена шыпе*л*а, / Ка*л*і на хва*л*і *л*івень *л*ёг... / Засумава*л*ы, бе*л*ы, бе*л*ы / *Л*яціць уда*л*еч матыл*ё*к...». З дапамогай алітэрацыі, шматразовых паўтораў зычных гукаў [л], [л'], [н'], [з'], [с'] аўтар перадае эмацыянальную атмасферу верша. Найбольш часта паўтараецца мяккі гук [л']. Адразу ўзнікае адчуванне цішыні, спакою, млявасці, лёгкасці. Гэта пачуццё агортвае чалавека быццам аблокі. Мяккія гукі задаюць інтанацыйны настрой твора.

Выкарыстанне алітэрацыі ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля» дазваляе не толькі пранікнуцца атмасферай твора, але і дапамагае прадчуваць набліжэнне пэўных падзей, з'яў прыроды: «А до*ждж ш*уміць, а до*ждж* гу*дз*е, / І бліжай-бліжай ён і*дз*е... / І вось *ж*ахнула бліскаві*ц*а, / Як вокамгненная крыні*ц*а, / І г*р*ом-пя*р*ун сталёвым бі*ч*ам, / Бы нейкі зве*р* сталёвым лы*ч*ам, / А*р*э-*т*расе, кало*ц*іць хма*р*ы...». Тут паўторы шыпячых і свісцячых гукаў, гука [р] дапамагаюць прадбачыць набліжэнне грому, ствараюць гукавы эфект, гукавое ўяўленне падзей.

Яшчэ адным майстрам гукапісу з'яўляецца Янка Купала. У «Песні званара» аўтар выкарыстоўвае шмат мастацкіх прыёмаў, якія перадаюць эмацыянальны настрой твора. Гэта і гукавыя стыкі, і анафары, і эпіфары. Аднак вельмі цікавым з'яўляецца той факт, што выкарыстанне гэтых прыёмаў у сукупнасці ўзмацняе мастацкую выразнасць асанансу: «Р*а*згудзіцца мой звон ад *а*кон да *а*кон, / Душы збудзіць, па сэрц*а*х уд*а*р*а*, / Дрогнуць сковы ц*я*мніц, блісн*у*ць іскры з*а*рніц, / З*а*в*а*руш*а*цца *я*ры, п*а*п*а*ры». Зычныя гукі [р], [з], [г], [дз], [д], [к], [ц], [б], [с] і іх спалучэнні ўзмацняюць гучанне галоснага [а].

Таксама яркі прыклад алітэрацыі можна знайсці ў вершы Максіма Багдановіча «Зімою»: «Як мары, белыя бярозы / Пад сінявой начной стаяць, / У небе зоркі ад марозу / Пахаладзеўшыя дрыжаць». Гукі [р], [з], [дз], [ж] і іх спалучэнні ствараюць атмасферу ціхага, але марознага вечару.

Верш Максіма Багдановіча «Маёвая песня» насычаны падаўжэннямі зычнага гука [ц], што дапамагае стварыць атмасферу хуткаплыннасці жыцця, як у матылька: «Па-над белым пухам вішняў, / Быццам сіні аганёк, / Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі / Сінякрылы матылёк». Гукі [к'], [б'], [б] яшчэ больш узмацняюць гукавы эфект алітэрацыі.

Пункціры Алеся Разанава раснастайна, яскрава, маляўніча перадаюць прыгажосць навакольнага асяроддзя: «Снег усцілае зямлю, / на снег / сцелецца жоўта-барвовае лісце: / мастачка-восень». З дапамогай алітэрацыі гукаў [с'], [ц'] аўтар пагружае чытача ў атмасферу надыходу зімы. Адразу ўяўляюцца апошнія залатыя дні восені. «Пад небам асеннім / калодзежны журавель: / скардзіцца, што не можа / лётаць?!.». Алітэрацыя гукаў [дз'], [ж], [р] і іх спалучэнні перадаюць атмасферу смутку, скаванасці, няўпэненасці, скаргі, незадаволенасці, чым узмацняюць настрой усяго пункціра.

Гукі [р], [к], [м'] [н'] і іх спалучэнні [рк], [кр] дапамагаюць чытачу пабудаваць, уявіць саму істоту або прадмет: «Змяркаецца. / У парку крычаць вароны – / і крыкам намацваюцца, / што яны ёсць»; «Каменне ў затоцы, / сярод камення / шэрыя качкі: / восеньскі зморак».

Аўтар не абмяжоўваецца выкарыстаннем толькі аднаго прыёму, а памайстэрску спалучае некалькі: «Вагаецца вецце / асенніх дрэў – / і вагае, / аплёўшы сваімі ценямі, / дом». Асананс гукаў [а], [е] у камбінацыі з алітэрацыяй гукаў [в], [в'], [ц] перадаюць не толькі рух, ваганне галін дрэў, а і ствараюць ілюзію ўсемагутнасці, нерэальнасці прыроды і рэчаіснасці. Аўтар надзяляе лёгкія, трапяткія лісточкі дрэў звышнатуральнай сілай.

Яшчэ адным майстрам гукапісу з'яўляецца Хрысціна Лялько. З дапамогай алітэрацыі аўтар вельмі вобразна і дакладна перадае гукі грому і адначасова стан душы чалавека, яго занепакоенасць, трывогу, страх: «Грому парожняю калясніцай / разбудзіць мяне навальніца / сярэдначы ўстаць і маліцца». Галосныя гукі і іх паўторы ў наступным пункціры вымалёўваюць карціну ціхага, сумнага вечара і ствараюць вобраз часу з яго хуткаплыннасцю, зменлівасцю. Аўтар раздумвае над філасофскім пытаннем: чаму жыццёвыя шляхі людзей так часта разыходзяцца? «Шмат развітанняў, / мала сустрэчаў – / аддаляецца ранне, / набліжаецца вечар…». Хрысціна Лялько спалучае розныя стылістычныя прыёмы ў сваёй творчасці. Так, у наступным вершы гарманічна і вобразна спалучаюцца афарызм (вострыя ў лёсу слёзы), эпіфара, асананс (лёсу слёзы), алітэрацыя (лёсу слёзы): «Як вецер у чыстым полі, / праніжа думка міжволі, / я ведаю, чаго не будзе ніколі. / Як камень на сэрца ляжа, / і штосьці яму падкажа: / жыццё ўсё само развяжа. / Не спяшы запрагаць і ехаць – / нічога не зробіш спехам / і жаль не

заслоніш смехам. / Хай выльюцца чыстыя слёзы, / заменяцца вершы прозай… / вострыя ў *лёсу слёзы*».

Такім чынам, можна адзначыць, што ў паэтычных творах гукапіс выступае адным з апорных элементаў, своеасаблівым стылістычным прыёмам, пры дапамозе якога аўтары перадаюць не толькі гукі рэальнай прыроды, а і выражаюць свае пачуцці, эмоцыі. У паэтычным кантэксце гук становіцца на адзін функцыянальны ўзровень са словам – валодае як формай, так і сэнсам. Адрозненне паміж імі ў тым, што калі фармальны і змястоўны кампаненты слова мы ведаем спачатку, то пра змест гука мы можам даведацца толькі ў канкрэтна акрэсленым кантэксце.

***Бібліяграфічны спіс***


1. Малажай, Г. М. Лінгвістычны аналіз тэксту : вучэб. дапам. / Г. М. Малажай. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1992. – 367 с.
2. Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці : для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. – Мінск : Нар. асвета, 2009. – 303 с.


# МІФАЛАГІЧНА-МІСТЫЧНЫЯ І РЭАЛІСТЫЧНЫЯ МАЛЮНКІ Ў АПОВЕСЦІ А. КАЗЛОВА «НЕЗЛАМАНАЯ СВЕЧКА»


*Т. М. Тарасава (Мінск, Беларусь)*



Сучасная беларуская проза вылучаецца глыбіннай засяроджанасцю на духоўным свеце сучасніка, гарманічным спалучэннем міфалагічна-містычных і рэалістычных малюнкаў у творах. Прысутнасць у сённяшняй прозе старэйшага і маладога пакалення пісьменнікаў вызначае разнастайнасць творчых метадаў даследавання рэчаіснасці, стылёвых і жанравых трансфармацый. Дастаткова пашыранай з'явай стала сёння спалучэнне як рэалістычных, так і ўмоўных сродкаў паказу жыцця пісьменнікам А. Казловым. У аповесці «Незламаная свечка» (2000) арганічна паяднаны рэалістычная і містычна-фальклорная прасторы: выкарыстанне замоў, праклёнаў і іншых язычніцкіх «практыкаванняў». Міфапаэтычны падтэкст твора паглыбляе унутраны свет герояў, аналіз псіхалагічных працэсаў у сітуацыі парога/мяжы.



***Ключавыя словы:*** міфалагічна-містычны малюнак; рэалістычная прастора; беларуская проза; экзістэнцыяльны аспект.


Сучасная беларуская проза вылучаецца глыбіннай засяроджанасцю на духоўным свеце сучасніка, сілай эмацыянальнага ўздзеяння на чытача, гарманічным спалучэннем міфалагічна-містычных і рэалістычных малюнкаў у творах. У літаратуры канца XX–пач. XXI ст. плённа працавалі і працуюць пісьменнікі з ярка выражанай творчай індывідуальнасцю (Янка Брыль, Васіль Быкаў, Іван Шамякін, Іван Пташнікаў, Віктар Казько, Андрэй Федарэнка, Ігар Бабкоў, Пятро Васючэнка, Адам Глобус, Барыс Пятровіч, Уладзімір Сцяпан і інш.). Іх творы сталі набыткам шырокага чытача, атрымалі прызнанне літаратурнай грамадскасці. Апошняе дзесяцігоддзе XX ст. дало магчымасць старэйшаму пакаленню пісьменнікаў увесці ў літаратуру цэлы